новыми. Это игры, заставляющие думать, предоставляющие возможность ребёнку проверить и развить свои способности, включающие его в соревнования с другими детьми.

Участие дошкольников в таких играх способствует их самоутверждению, развивает настойчивость, стремление к успеху и различные мотивационные качества. В таких играх совершенствуется мышление, включая действия по планированию, прогнозированию, взвешиванию шансов на успех, выбору альтернатив.

Игра — это метод познания действительности. Он направляется внутренними силами и позволяет ребёнку в короткие сроки овладеть первоначальными, но весьма обширными основами человеческой культуры. Сущность игры как ведущего вида деятельности дошкольника заключается в том, что дети отражают в ней различные стороны жизни, особенности взаимоотношений взрослых, уточняют свои знания об окружающей действительности. Происходит значительное расширение и углубление знаний, совершенствуются умения и навыки ребёнка.

Особое значение для развития в этом возрасте имеют стимулирование и максимальное использование мотивации достижения успехов в учебной, трудовой, игровой деятельности детей. Усиление такой мотивации, для дальнейшего развития которой дошкольный возраст представляется особенно благоприятным временем жизни, приносит двоякую пользу: во-первых, у ребёнка закрепляется весьма полезная и достаточно устойчивая личностная черта — мотив достижения успеха, доминирующий над мотивом избегания неудачи; во-вторых, это приводит к ускоренному развитию разнообразных способностей ребёнка [2, с. 54].

К концу дошкольного возраста повышенное значение для детей приобретают отношения со сверстниками. Здесь открываются дополнительные возможности для активного использования этих отношений в учебно-воспитательных целях, в частности, для стимулирования психического развития ребёнка через публичное одобрение в присутствии товарищей его поступков и достижений, через соревнование со сверстниками, через многие другие действия и ситуации, затрагивающие социальный престиж ребёнка.

В практике дошкольного воспитания проблеме самостоятельности дошкольника в бытовом труде уделено особое место. Самостоятельность воспитывается при выполнении детьми обязанностей по обслуживанию себя и близких людей; уровень самостоятельности связан с освоением социального опыта трудовой деятельности, возможностью проявления ребёнком в труде субъектной позиции. Основные ошибки взрослых в воспитании детской самостоятельности в раннем возрасте — две прямо противоположные тактики: гиперопека ребёнка и полное устранение от поддержки его действий. В первом случае у него развивается инфантилизм, во втором — синдром беспомощности.

**Заключение.** Фундамент ответственности и самостоятельности закладывается на границе раннего и дошкольного возраста, дальнейшее развитие самостоятельности как личностного качества в период дошкольного детства связано с развитием основных видов деятельности: игры, бытового труда, конструирования, художественной и учебной деятельности. Каждый вид детской деятельности оказывает своеобразное влияние на развитие активности и инициативы, поиск адекватных способов самовыражения в деятельности, освоение способов самоконтроля, воспитание волевого аспекта самостоятельности.

**Список цитируемых источников**

1. *Мухина, В. С.* Возрастная психология / В. С. Мухина — М., 1988. — 213 с.
2. *Камерина, Н. К.* Деловое построение развивающей среды / Н. К. Камерина // Дет. сад. управление. — 2003. — № 2. — С. 5—10.

Репозиторий БарГУ

УДК 374

**Тарасюк Ганна Вячаславаўна**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Навамышскі яслі-сад», в. Новая Мыш,*
*Рэспубліка Беларусь, anna_tarasyuk@inbox.ru*

## ЭФЕКТЫЎНЫЯ ФОРМЫ РАБОТЫ ПА ФАРМІРАВАННІ БЯСПЕКІ ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦІ ДЗЯЦЕЙ СТАРЭЙШАГА ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

У артыкуле актуалізуецца праблема фарміравання бяспечнай жыццядзейнасці дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту. Асаблівая ўвага надаецца выкарыстанню найбольш эфектыўных форм арганізацыі працы педагога з дзецьмі і іх бацькамі па фарміраванні асноў бяспекі жыццядзейнасці дзяцей.

**Ключавыя словы:** бяспека жыццядзейнасці; дзеці старэйшага дашкольнага ўзросту; эфектыўныя формы работы.

© Тарасюк Г. В., 2021

**Tarasiuk Hanna Viachaslavauna,**
*Novaya Mysh Nursery-kindergartden, Novaya Mysh, Baranavichy district, Belarus, anna_tarasyuk@inbox.ru*

## EFFECTIVE FORMS OF WORK ON THE FORMATION OF LIFE SAFETY OF OLDER PRESCHOOL CHILDREN

The article actualizes the problem of formation of safe life activity of older preschool children. Special attention is paid to the use of the most effective forms of organizing the teacher's work with children and their parents to form the basis for the safety of children's life.
**Key words:** life safety; older preschool children; effective forms of work.

**Уводзіны.** Усё жыццё чалавека незалежна ад узросту звязана з яго бяспекай. Ужо з першых гадоў жыцця дапытлівасць дзяцей, іх актыўнасць у пазнанні навакольнага асяроддзя вельмі часта становяцца небяспечнымі для іх саміх. У любы момант дзеці могуць апынуцца ў непрадказальным становішчы на вуліцы або дома. Вельмі важным для нас, дарослых, з'яўляецца не толькі тое, каб аберагаць дзяцей ад небяспекі, але і рыхтаваць іх да магчымай сустрэчы з ёю, фарміраваць уяўленне аб найбольш небяспечных сітуацыях, аб неабходнасці захавання мер засцярогі, навыкі бяспечных паводзін у побыце сумесна з бацькамі, якія выступаюць прыкладам для пераймання.

Галоўнай задачай педагогаў з'яўляецца падрыхтоўка дзяцей да бяспечнага жыцця ў навакольным асяроддзі. І гэта не толькі набыццё нейкіх тэарэтычных ведаў і фарміраванне практычных уменняў, але і стымуляванне развіцця ў іх самастойнасці і адказнасці.

Першыя пяць-шэсць гадоў жыцця дзіцяці з'яўляюцца найбольш прадуктыўнымі для атрымання і засваення важнай інфармацыі. У гэты перыяд хуткім тэмпам ідзе назапашванне ведаў, фарміруецца маўленне, удасканальваюцца пазнавальныя працэсы, адбываецца авалоданне простымі спосабамі разумовай дзейнасці, развіццё пазнавальных здольнасцей [1, с. 5]. Таму гэты ўзрост з'яўляецца найбольш аптымальным для фарміравання бяспечных паводзін.

Вельмі важным у працы педагога з'яўляецца пошук тых форм, метадаў і сродкаў арганізацыі адукацыйна-выхаваўчага працэсу, якія былі б эфектыўнымі і адначасова цікавымі для дзяцей. Найбольш выніковай з'яўляецца тая праца, якая праводзіцца планамерна і сістэматычна.

**Асноўная частка.** Улічваючы перадавы педагагічны вопыт, а таксама вопыт калег, у сваёй працы па фарміраванні бяспекі жыццядзейнасці мы звярнуліся да наступных форм работы: гульня, чытанне мастацкай літаратуры з наступным яе абмеркаваннем, назіранні, разгляданне малюнкаў, ілюстрацый і рэпрадукцый, прагляд мультфільмаў і відэаролікаў, прапанаваных Міністэрства па надзвычайных сітуацыях (МНС), прадуктыўная дзейнасць (лепка, маляванне, канструяванне), спартыўныя забавы. Але найбольш эфектыўнымі, цікавымі формамі працы з дзецьмі, на наш погляд, сталі: квэст-гульні, экскурсіі і сустрэчы з прадстаўнікамі МНС, Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі, удзел у тэатральнай дзейнасці і здымках відэаролікаў у межах дадзенай тэмы.

Выкарыстоўваючы такую форму як квэст, дасканала пазнаёміліся з усімі тэарэтычнымі аспектамі квэст-гульні, тэхналогіяй яе правядзення, а таксама стварылі неабходныя ўмовы для яе рэалізацыі. Пасля гэтага распрацавалі і правялі квэст-гульні «Прыгоды дамавічка Кузі», «Небяспека вакол нас», «Падарожжа ў краіну Бяспекі».

У выніку гэтай працы прыйшлі да высновы, што квэст-гульня дазваляе педагогу замацаваць ужо атрыманыя веды дзяцей, актывізаваць увагу і развіваць пазнавальную цікавасць. У час выканання заданняў квэст-гульні ў дзяцей фарміруецца адчуванне асабістай зацікаўленасці, выхоўваюцца дабразычлівыя ўзаемаадносіны паміж дзецьмі, развіваецца адказнасць за свае ўчынкі. Квэсты даюць магчымасць абыграць жыццёвыя сітуацыі, прыблізіць гульню да рэальнага жыцця. Такая гульня выклікае ў дзяцей жаданне выконваць правілы шляхам пазнання, а не забароны. З іх дапамогай дзеці разумеюць, што небяспеку можна пазбегнуць тады, калі паводзіць сябе правільна.

Зацікаўленасць дзяцей і эфектыўнасць работы па фарміраванні бяспекі жыццядзейнасці выклікалі сустрэчы з прадстаўнікамі службы выратавання, а таксама экскурсіі на месца іх працы. Для дзяцей выратавальнік — гэта чалавек гераічны, аўтарытэтны. Павага да яго, цікавасць да гэтай прафесіі становяцца стымуламі для бяспечных паводзін. Дзецьмі зусім па-іншаму засвойваюцца правілы бяспекі, калі пра гэта распавядаюць выратавальнікі або супрацоўнікі іншых служб спецыяльнага прызначэння. Таму педагогамі нашай установы дашкольнай адукацыі была арганізавана экскурсія ў Баранавіцкі гаррайаддзел па надзвычайным сітуацыям. Асноўнымі задачамі гэтай экскурсіі былі: фарміраванне ўяўленняў аб прафесіі выратавальніка і яе значнасці, пашырэнне ведаў па пажарнай бяспецы, а таксама паводзін і рэакцыі пры ўзнікненні пажару або небяспечнага становішча.

Падчас экскурсіі супрацоўнік МНС распавядаў пра абсталяванне, арганізацыю працы і, вядома, аб правілах бяспекі. Дзеці атрымалі ўнікальную магчымасць паглядзець, ацаніць і нават дакрануцца да жыцця выратавальнікаў. У атмасферы павышанай цікавасці значна лепш запаміналіся правілы бяспечных паводзін.

Рэпазіторый БарДУ

Яшчэ адной вельмі цікавай формай працы як для дзяцей, так і для педагогаў з’явілася стварэнне тэатральнай пастаноўкі «Желанье пуще неволи, или как мы хотели стать спасателями». Галоўнай задачай гэтага спектакля было не толькі развіццё артыстычных здольнасцей дзяцей, але і фарміраванне асноў бяспечных паводзін у побыце і соцыуме. Важна тое, што гэтая задача ставілася не толькі для ўдзельнікаў гэтай пастаноўкі, але і для гледачоў спектакля, выхаванцаў нашай і іншых устаноў дашкольнай адукацыі. У час знаёмства дзяцей з тэкстам тэатральнай пастаноўкі абмяркоўваліся паводзіны галоўных герояў, іх учынкі з пункту гледжання бяспекі жыццядзейнасці. У час такіх дыскусій дзеці аналізавалі, рабілі высновы, тым самым замацоўвалі правілы бяспекі.

Стварэнне відэаролікаў «Уроки безопасности для Маши», «Гордимся, что научили!» стала яшчэ адной эфектыўнай формай працы з дзецьмі. Тэатральная пастаноўка і відэаролікі папоўнілі метадычную скарбонку нашай установы дашкольнай адукацыі, сталі нагляднымі дапаможнікамі ў працы па фарміраванні асноў бяспекі жыццядзейнасці.

Выхаванне і развіццё дзяцей дашкольнага ўзросту ажыццяўляецца пераважна ў двух адукацыйна-выхаваўчых інстытутах — сям’я і ўстанова дашкольнай адукацыі. Бацькі і педагагічныя работнікі — выхавальнікі адных і тых жа дзяцей. Вынік выхавання можа быць паспяховым толькі тады, калі бацькі і педагогі стануць супрацоўнікамі. Такое супрацоўніцтва дазваляе лепш пазнаць дзіця, паглядзець на яго з розных бакоў, убачыць яго ў розных сітуацыях. Сёння ў аснове новай філасофіі ўзаемадзеяння сям’і і установы дашкольнай адукацыі ляжыць ідэя аб тым, што за выхаванне дзяцей нясуць адказнасць бацькі, а ўсе іншыя сацыяльныя інстытуты заклікаöаны дапамагчы, падтрымаць, накіраваць, дапоўніць іх выхаваўчую дзейнасць.

Жыццёвы вопыт і навуковыя даследаванні даказалі, што ўсе беды дзяцей, а потым і дарослых тлумачацца памылкамі сямейнага выхавання. Прызнанне прыярытэту сямейнага выхавання патрабуе новых адносін сям’і і ўстановы дашкольнай адукацыі. Навізна гэтых адносін вызначаецца паняццямі «супрацоўніцтва» і «ўзаемадзеянне». Аналіз практыкі ўзаемадзеяння з сем’ямі выхаванцаў установы дашкольнай адукацыі сведчыць аб тым, што найбольш эфектыўнымі формамі працы з бацькамі сталі:

– правядзенне апытанняў, анкетаванне бацькоў («Безопасность ваших детей», «Роль семьи в обучении детей ПДД», «Безопасность ребёнка в квартире»);

– правядзенне бацькоўскіх сходаў і сустрэч клуба «Сямейная гасцёўня» сумесна з прадстаўнікамі МНС і дзецьмі;

– сумесныя штогадовыя акцыі («Стань заметнее в темноте», «Осторожно: гололёд!»);

– распрацоўка памятак і буклетаў, правядзенне кансультацый для бацькоў («Ваша дзіця і яго бяспека ў сучасным грамадстве», «Небяспека вакол нас», «Бяспечны маршрут з дому ў дзіцячы сад», «Парады бацькам па ахове жыцця і здароўя дзяцей», «Бяспечнае лета», «Фликеры детям купите, родители, пусть на дороге их видят водители!», «Не оставляйте детей без присмотра», «Как знакомить детей с основами безопасности», «Ребёнок и огонь: обеспечить безопасность», «Использование и хранение опасных предметов»);

– сумеснае правядзенне тэматычных тыдняў, экскурсій;

– сумесная падрыхтоўка тэатральных пастановак і стварэнне відэаролікаў.

Такія формы працы з бацькамі спрыяюць павышэнню педагагічнай кампетэнтнасці бацькоў, дапамагаюць станоўча ўплываць на якасць выхаваўчага працэсу і развіцця дзяцей. Адзіныя патрабаванні педагогаў і бацькоў з’яўляюцца асновай трывалых навыкаў бяспечных паводзін дзяцей. Толькі ўзаемадзеянне сем’яў і дзіцячага сада стварае аптымальныя ўмовы для ўваходжання маленькага чалавека ў вялікі свет здаровым і прыстасаваным для бяспечнага жыцця.

**Заключэнне.** Сістэматычная планамерная работа, якая прадугледжвае выкарыстанне разнастайных эфектыўных форм працы з дзецьмі і іх бацькамі, у аснове якой ляжыць практычная дзейнасць, садзейнічае паспяховаму фарміраванню асноў бяспечнай жыццядзейнасці. У выніку такой працы дзеці не толькі набываюць новыя веды аб нормах бяспечных паводзін, але і паспяхова ўжываюць іх на практыцы. Яны ведаюць асноўныя правілы асабістай бяспекі, умеюць фармуляваць, тлумачыць неабходнасць іх прымянення ў экстрэмальных сітуацыях, а таксама могуць прадбачыць бяспечнае становішча.

Сучасная рэчаіснасць патрабуе ад нас, педагогаў, хуткага рэагавання на змены ў грамадскім жыцці, навуковым і тэхнічным асяроддзі. Таму мы павінны знаходзіцца ў няспынным пошуку новых ідэй, якія будуць адпавядаць сучаснасці.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Загвоздкина, Т. В.* Безопасность жизни и деятельности дошкольников : пособие для педагогов дошк. учреждений / Т. В. Загвоздкина. — Минск : Полымя, 2001. — 192 с.

Репозиторий БарГУ